# Заключная прамова старшыні Савету Народных Камісараў Беларускае ССР тав. Яз. А. Адамовіча.

Мне засталося мала сказаць у заключнай прамове, бо выступаўшыя таварышы адзначылі асноўныя бакі працы і дзейнасьці Ўраду БССР і становішча Беларусі і амаль што ўсе згаджаліся ў асноўным з дакладам і з тым малюнкам, які мы перад Сэсіяй ЦВК Саюзу ССР намалявалі.

Я адзначу толькі некалькі фактычных момантаў і ў канцы прыпынюся на некаторых дадатковых пытаньнях.

Некаторыя таварышы мяне папракалі за тое, што я не прыпыніўся ў дакладзе на становішчы Чырвонае арміі, на рабоце нашых грамадзкіх організацый, на становішчы спраў у галіне аховы здароўя і г. д. Я ня мог на ўсім гэтым прыпыніцца проста таму, што мой даклад ў гэтым выпадку цягнуўся-б не чатыры гадзіны, а ў два разы болей,—гэта, па-першае; па-другое, у гэтым ня было ніякай патрэбы, хоць-бы па адным таму, што кніга аб БССР, якая раздадзена тут членам ЦВК, цалкам асьвятляе стан і становішча ўсіх галін працы і дзейнасьці Ўраду БССР, усіх галін жыцьця рабочых і сялян савецкай Беларусі. Таму я таксама ня буду адказваць на цэлы шэраг іншых пытаньняў чыста даведкавага зьместу, як, напрыклад, аб клясавым складзе нашых Савецкіх органаў, складзе нацыянальных нашых савецкіх органаў, разьмеркаваньні сродкаў па дзяржаўнаму і мясцоваму бюджэце і г. д., бо таварышы знойдуць адказы на ўсе гэтыя запытаньні ў тэй-жа кнізе. Усе зьвесткі дадзены там з вычэрпваючаю поўнасьцю.

Таварыш Пятроўскі заўважыў, што кніга вельмі тоўстая. Справа ў тым, што мы ўпяршыню пішам кнігу аб Савецкай Беларусі для шырокіх пластоў рабочых і сялян, для шырокага асьвятленьня стану і становішча Беларусі. Гэта кніга, значыцца, носіць ня толькі справаздачны, але некалькі энцыклёпэдычны характар, паколькі яна характэрызуе ўсе бакі жыцьця і дзейнасьці рабочых і сялян Савецкай Беларусі. Ужо адно тое, што тав. Пятроўскі сказаў, што гэтую кнігу варта было-б паслаць эўропэйскім вучоным, каб яны былі інформаваны аб тым, як мы вядзем працу,—гаворыць за тое, што кніжка заслугоўвае ўвагі.

Таму мы маем надзею, што таварышы прачытаюць гэту кніжку і ўпэўняцца ў карыснасьці яе тым больш, што ніякіх другіх іншых дадатковых матар'ялаў мы ня выдавалі. Акрамя таго, патрэбнасьць выданьня гэтае кнігі, якая поўнасьцю асьвятляла-б усе бакі БССР, выклікаецца тым, што Беларусь перажыла шэраг узбуйненьняў, па прычыне чаго

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

зьмяніліся тэрыторыяльныя межы, склад насяленьня, гаспадарчыя элемэнты і г. д. Натуральна, што цяпер, пасьля апошняга ўзбуйненьня і далучэньня да нас Гомельшчыны, нам трэба было канчаткова скласьці ў адно ўсе матар'ялы для таго, каб даць поўны малюнак Савецкай Беларусі. Такога роду меркаваньне зусім апраўдвае мэтазгоднасьць выданьня гэтай кнігі ў тым выглядзе, як яна ёсьць. Магчыма, што там ёсьць некаторыя абмылкі, але гэта тлумачыцца тым, што мы мелі надзвычайна мала часу на яе выданьне, бо мы стараліся выдаць яе да Сэсіі.

Таварыш Воўкаў мяне не зразумеў, калі казаў, што ў нас на Беларусі ад 30 да 40 проц. беспрацоўных, гэта ня так. Я казаў, што ў нас да 35 тысяч беспрацоўных у гарадох. Гэта не складае 30, ці 40 проц., а ў адносінах да гарадзкога насяленьня гэта складае прыкладна да 4%. Што-ж тычыцца незанятага лішку, свабоднае сілы на вёсцы, дык, сапраўды, яе ў нас ёсьць ад 30 да 40 проц. Гэта зьявішча ня чыста беларускае, а агульна-саюзнае зьявішча. Пры вялізарнай перанаселенасьці, пры нізкай прыбытковасьці з сялянскае дзесяціны, пры малым процанце засеву плошчы пад працаёмкія культуры, пры нізкай тэхніцы сельскае гаспадаркі, натуральна, што па вёсках Беларусі ёсьць лішак рабочай сілы, таксама, як і ў іншых раёнах Савецкага Саюзу. Пры далейшай інтэнсыфікацыі сельскае гаспадаркі, пры разгортваньні працаёмкіх культур, пры павялічэньні таварнасьці сялянскае гаспадаркі і адначасна—пры разгортваньні індустрыялізацыі ва ўсім нашым Саюзе, у тым ліку і на Беларусі, а таксама ў зьвязку з разгортваньнем мэліярацыйных работ у нас, той лішак рабочае сілы, які ёсьць, будзе ўсё больш і больш праглынацца ў вытворчасьці і ўцягвацца ў карысную працу.

Тав. Скрыпнік учора казаў, што процант вучняў беларускай нацыянальнасьці ў вышэйшых навучальных установах і школах невыстарчаючы. Гэта правільна, і гэта ня ёсьць зьявішча выпадковае, бо такое фактычнае становішча ў культурных адносінах: мы ня можам сёньня пасlаць беларусоў у вышэйшыя школы ў такім ліку, у якім нам гэта хацелася-б, па прычыне таго, што мы павінны паслаць таксама і рабочых з гарадоў, а ў нас рабочыя пераважна рускія, яўрэі, палякі і г. д. Вось па гэтай прычыне скарачаецца процант беларусоў у вышэйшых школах і тэхнікумах і ў сярэдніх навучальных установах. Акрамя таго, ёсьць яшчэ

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы